Весці
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 2(44) 2005

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

Галоўны рэдактар:
П. Дз. Кухарчык

Рэдакцыйная калегія:
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
(нам. галоўнага рэдактара)
В. В. Бушчык
(нам. галоўнага рэдактара)
Ю. А. Быкадораў
(нам. галоўнага рэдактара)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
(адказны сакратар)
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

Змест

Гісторыя

Да 60-годдзя Вялікай Перамогі

Жылінскі М. Г. Патрыятычная барацьба супраць германскіх агрэсараў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны як адзін з вызначальных фактараў перамогі над ворагам 3

Касовіч А. В. Антыгерманскі рух на тэрыторыі Беластоцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны 8

Канапацкі І. Б. Удзел татараў у Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі 12

Новікаў С. Я. Эканамічная палітыка германскіх акупантаў у Беларусі 1941—1944 гг. 15

Нікалаева І. У. Выкарыстанне нямецкімі акупантамі працы жаночага насельніцтва Беларусі ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах (1941—1944) 28

Вінніца Г. Р. Хапакост у Оршы 31

Шкуцько Л. Л., Канапацкі І. Б. Брацкая дапамога народаў СССР беларускаму народу ў аднаўленні разбуранай гаспадаркі. 1943—1945 гг. 34

✧ ✧ ✧

Пуцік У. С. Да пытання аб вытоках абмежавання ўплыву беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі на этапе капіталізму 37

Талкачоў В. І. Трансфармацыя беларускай нацыянальнай дзяржаўнай ідэі ў дакументах беларускіх палітычных партый і працах нацыянальных дзеячаў 39

Жылінская І. У. Саюз Вялікабрытаніі і СССР у грамадскай думцы Англіі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны (1939—1941 гг.) 43

Багалейша С. В. Польска-літоўскі канфлікт і Беларусь 47

Філасофія

Міхневіч А. А. Пазіцыя асобы як агульная мэта фарміравання нацыянальнай самасвядомасці студэнта 54

Круглова Г. А. НТР у асноўных канцэпцыях «хрысціянскай глабалістыкі» 59

Паліталогія

Землякоў Л. Я. Палітычныя асновы патрыятызму і яго фарміраванне ў маладзёжным асяроддзі сучаснага беларускага грамадства 65

Зенчанка В. А., Паўлава Н. В., Сцяпанаў Г. І. Праблемы фарміравання палітычнай культуры студэнцкай моладзі ва ўмовах станаўлення грамадзянскага грамадства 68

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 32.001—057.87

В. А. Зенчанка, Н. В. Паўлава, Г. І. Сцяпанаў

ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ПАЛІТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ ГРАМАДЗЯНСКАГА ГРАМАДСТВА

Сучасная вышэйшая школа заклікана не толькі ажыццяўляць падрыхтоўку кампетэнтных спецыялістаў, але і садзейнічаць працэсу станаўлення асобы студэнта, фарміраванню ў яго грамадзянскай пазіцыі, якая заключаецца ў выкананні прынятых законаў, удзеле ў рэалізацыі практычных задач абнаўлення грамадства. У пераходны перыяд імкліва мяняюцца каштоўнасныя асновы грамадства, з'яўляюцца новыя сацыяльныя адносіны і ўмовы жыцця. Гэтыя змены ў сваю чаргу выстаўляюць новыя патрабаванні да асобы і яе паводзін, якія павінны адказваць запатрабаванням грамадства, выклікаюць неабходнасць выхавання ў маладых людзей такіх якасцей, як грамадзянскасць, павага да асобы і правоў чалавека, адказнасць і асэнсаванасць жыцця ў дэмакратычнай і прававой дзяржаве, у грамадзянскім грамадстве. У сувязі з гэтым зразумела актуальнасць праблемы фарміравання ў моладзі дэмакратычнай палітычнай культуры як адной з важнейшых умоў паспяховага рэфармавання нашага грамадства.

Палітычная культура з'яўляецца адной са складальных базавай культуры асобы. Паказчыкамі палітычнай культуры з'яўляюцца палітычная адукаванасць, наяўнасць сфарміраваных грамадска-палітычных поглядаў і перакананняў, уменне прымяняць іх у практычнай грамадска-палітычнай дзейнасці. Сутнасць палітычнай культуры асобы заключаецца ў яе поглядах, адэкватна адлюстроўваючых рэальныя сацыяльныя, палітычныя працэсы, жаданне і здольнасць самастойна ацэньваць і разбірацца ў падзеях і з'явах грамадскага жыцця і разумець іх з агульначалавечых пазіцый, выбіраць уласную лінію паводзін. Праз палітычную культуру адбываюцца самарэалізацыя асобы, рэгуляванне уласных паводзін, уключанасць ва ўсе сацыяльныя сферы. У палітычнай культуры спалучаюцца палітычная кампетэнтнасць, талерантнасць, цярпімасць да іншадумства. Палітычная кампетэнтнасць уключае ў сябе фарміраванне і развіццё ведаў і разуменне палітычнай тэорыі, палітычнай сітуацыі ў грамадстве.

Рэальнасць нашага часу прадугледжвае пераадоленне дагматычнага мыслення, склаўшыхся ўяўленняў, паняццяў і стэрэатыпаў, адыход ад састарэлых схем і падыходаў, зварот да інтарэсаў і патрэб моладзі.

Такім чынам, палітычная культура з'яўляецца састаўной часткай светапогляднай накіраванасці асобы. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў значнай ступені залежаць ад палітычнай арыентацыі моладзі, значную частку якой складае студэнцтва, таму праблема вывучэння палітычнай культуры моладзі набывае сёння асаблівую актуальнасць. Вялікая роля належыць палітычнай культуры ў станаўленні будучых спецыялістаў як людзей, здольных фарміраваць грамадзянскае грамадства, якія ўмеюць шукаць і знаходзіць выйсце з узнікаючых супярэчнасцей, здольны гібка рэагаваць на зменлівыя ўмовы. Якасная характарыстыка асобы грамадзянскага грамадства ўключае веданне эканамічных законаў, валоданне заканадаўча-прававымі ведамі і ўменне карыстацца імі ў практычнай дзейнасці.

Фарміраванне палітычнай культуры праходзіць па шматлікіх каналах уздзеяння: друк, тэлебачанне, радыё, сайты інтэрнета, разнастайныя аб'яднанні. У цяперашні час у Беларусі зарэгістравана больш за 130 аб'яднанняў моладзі. Развіццё студэнцкага грамадскага руху будзе садзейнічаць грамадскаму станаўленню будучага спецыяліста, фарміраванню прававой і палітычнай культуры.

Важнае значэнне ў рашэнні праблемы фарміравання палітычнай культуры студэнцкай моладзі належыць вучэбна-выхаваўчаму працэсу, чаму садзейнічае выкладанне прадметаў сацыяльна-гуманітарнага цыкла. Дзяржаўная стандартызацыя вышэйшай адукацыі па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін дала магчымасць пачаць рэалізацыю забеспячэння ў больш роўнай ступені прафесійнай, агульнакультурнай і асобаснай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Тым самым быў зроблены значны крок у бок больш спрыяльных умоў для далейшага духоўна-маральнага грамадзянскага выхавання і адукацыі студэнцкай моладзі. Задача вышэйшай школы на дадзеным этапе рэфармавання адукацыі — значна павялічыць час, які адводзіцца вучэбным планам на грамадазнаўчыя дысцыпліны. Гэта праблема павінна стаць прадметам сур'ёзнага навуковага аналізу на міждысцыплі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нарным узроўні і знайсці сваё адлюстраванне ў практыцы выхавання маладога пакалення.

Фарміраванню палітычнай культуры, грамадзянскасці будзе садзейнічаць увядзенне такіх спецкурсаў, як «Дэмакратыя як феномен палітычнай культуры», «Глабальныя ідэалогіі сучаснасці», «Грамадзянскае грамадства і прававая дзяржава» і г. д.

Значная роля ў фарміраванні светапоглядных прыярытэтаў у прафесійнай падрыхтоўцы маладых спецыялістаў належыць паліталогіі. Асноўная мэта курса паліталогіі ў ВНУ заключаецца ў тым, каб даць студэнтам сістэматызаваныя веды аб палітыцы як складанай грамадскай з'яве, растлумачыць асноўныя тэарэтычныя паняцці і навучыць карыстацца імі для аналізу палітычнага жыцця. Вывучэнне паліталогіі заклікана дапамагчы студэнтам сфарміраваць навуковае ўяўленне аб палітычных працэсах, якія адбываюцца ў сучасным свеце, выпрацаваць крытычнае рацыянальнае мысленне, засвоіць грамадзянскія каштоўнасці і нормы дэмакратычнай палітычнай культуры, авалодаць такімі якасцямі, як талерантнасць, гатоўнасць да кампрамісу і супрацоўніцтва, павага да закона, грамадзянскасць.

У працэсе выкладання тэарэтычных і практычных праблем палітычнай навукі складваюцца ўмовы для выхавання грамадзян, здольных не заставацца простым аб'ектам палітыкі дзяржавы ці маніпуліравання з боку розных палітычных сіл, а стаць па-сапраўднаму актыўным і свядомым суб'ектам грамадска-палітычнага жыцця.

Такім чынам, веды ў галіне паліталогіі складаюць неад'емную частку агульнай адукаванасці, інтэлектуальнага патэнцыялу будучага спецыяліста, а ўся сістэма грамадзянскай адукацыі і выхавання павінна быць адаптавана не толькі да патрэб дзяржавы, але і да ўзрастаючых сацыякультурных і духоўных запытаў самой асобы.

Ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі сучаснага беларускага грамадства актуальнай праблемай з'яўляецца даследаванне жыццёвага самавызначэння моладзі. З мэтай вывучэння характару і форм палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі, яе палітычных арыентацый кафедра паліталогіі і права БДПУ ў гэтым навучальным годзе правяла сацыялагічнае даследаванне, якое ахапіла 637 студэнтаў старэйшых курсаў універсітэта і Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута. Даследаванні насілі колькасна-якасны характар і праводзіліся метадам анкетнага апытання. Сярод апытаных былі прадстаўлены студэнты розных факультэтаў: гістарычнага, музычна-педагагічнага, прыродазнаўчага, рускай філалогіі, дашкольнага выхавання, студэнты эканамічных спецыяльнасцей, што сведчыць аб раўнамерным размеркаванні спецыяльнасцей пры выбары рэспандэнтаў.

У выніку праведзенага анкетавання адказы рэспандэнтаў на пытанне: «Прыхільнікам якой з існуючых ідэйна-палітычных плыней Вы з'яўляецеся» — паказалі, што найбольшая колькасць прыхільнікаў нацыянальнага адраджэння — 20 %, ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі і спалучэння розных ідэй — адпаведна 16,4 % і 16,2 %. А ліберальна-дэмакратычная ідэалогія — гэта ідэя прытрымлівання правоў чалавека, падтрымкі прадпрымальніцтва, прыватнай ініцыятывы, свабоднай канкурэнцыі, якая дае магчымасць маладым людзям лепш раскрыць свой патэнцыял, ідэя незалежнасці (не толькі асабістай свабоды чалавека, але і сацыяльных інстытутаў грамадзянскага грамадства).

Прыхільнікамі сацыял-дэмакратычнай ідэалогіі з'яўляюцца каля 9 % (8,7 %). Вельмі нізкі рэйтынг у прыхільнікаў кансерватыўнай ідэалогіі (0,6 %), а таксама камуністычнай і сацыялістычнай ідэалогій (1,4 %). Значная колькасць рэспандэнтаў не з'яўляецца прыхільнікамі ніякай ідэалогіі (34,7 %).

Варта падкрэсліць, што ў залежнасці ад ідэйна-палітычных пераваг моладзі ў значнай меры магчыма прагназаванне далейшага развіцця ў краіне сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў.

Сучасныя студэнты лепш за іншыя групы моладзі і прадстаўнікоў старэйшых узроставых катэгорый адаптуюцца да рыначных адносін ва ўмовах станаўленння сацыяльна арыентаванай эканомікі.

Такім чынам, атрыманыя вынікі апытання сведчаць у цэлым аб дэмакратычнай накіраванасці арыентацый студэнцкай моладзі пры ацэнцы ідэйна-палітычных плыней у сучасным грамадстве.

Разглядаючы праблему фарміравання палітычнай культуры студэнцтва, важна ўсвядоміць формы выяўлення інтарэсу маладых людзей да палітыкі. Як паказалі вынікі сацыялагічнага даследавання, 35,8 % апытаных зазначылі, што пільна сочаць за інфармацыяй аб палітычных падзеях у краіне і за яе межамі; 52,6 % рэспандэнтаў сістэматычна за палітычнай інфармацыяй не сочаць, але абмяркоўваюць палітычныя падзеі з сябрамі і роднымі. Асабісты ўдзел у праводзімых мітынгах і дэманстрацыях прымалі 2,6 % рэспандэнтаў, не выклікае палітыка інтарэсу ў 9 % апытаных. Сацыялагічныя даследаванні сведчаць не толькі аб слабай цікавасці да палітыкі, але і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палітычнай пасіўнасці, адхіленасці ад непасрэднага ўдзелу ў палітычным жыцці грамадства. Нягледзячы на тое што ў Беларусі ў наш час існуе больш за 130 грамадскіх аб'яднанняў моладзі як палітычнага, так і непалітычнага характару, рэальны ўдзел у іх дзейнасці студэнцтва нязначны. Так, на пытанне «Ці з'яўляецеся Вы членам якога-небудзь грамадскага аб'яднання? Калі так, то якога?» — толькі каля 30 % рэспандэнтаў адзначылі, што прымаюць удзел у рабоце грамадскіх маладзёжных аб'яднанняў, у тым ліку 21,6 % — БРСМ, які аб'ядноўвае 250 тыс. моладзі. Астатнія рэспандэнты асноўнымі прычынамі няўдзелу ў дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў называюць іх нізкую культуру дзейнасці, неадпаведнасць інтарэсаў аб'яднання з іх асабістымі інтарэсамі, а таксама іх малы ўплыў на жыццё нашага грамадства, на прыняцце палітычных рашэнняў.

У пэўнай ступені аб узроўні палітычнай і прававой культуры студэнтаў дазваляюць меркаваць іх адказы аб веданні асноўных палажэнняў дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, толькі 9,3 % апытаных упэўнены ў тым, што ведаюць вельмі добра асноўныя палажэнні Канстытуцыі, 19 % — практычна ведаюць, 53,1 % рэспандэнтаў адказалі, што ведаюць недастаткова ці вельмі слаба арыентуюцца ў асноўных палажэннях Канстытуцыі, 7,1 % было цяжка адказаць на гэта пытанне.

Прыведзеныя даныя сведчаць аб тым, што ў значнай часткі студэнцкай моладзі на параўнаўча нізкім узроўні сфарміравана палітычная і прававая культура, адсутнічаюць выразна акрэсленая грамадзянская пазіцыя і пачуццё нацыянальнай годнасці. Хоць за апошняе дзесяцігоддзе палітычная свядомасць моладзі значна змянілася — узрос прэстыж ведаў у іерархіі жыццёваважных каштоўнасцей маладых людзей — сталі пераважаць прагматычныя (асабісты дабрабыт, сямейны камфорт).

У гэтай сувязі дастаткова цікавымі з'яўляюцца адказы на пытанне аб тым, якія формы працы ў галіне грамадзянскага выхавання былі б для іх важнымі і больш карыснымі. У больш 70 % адказаў дамінуе імкненне вывучаць свой родны край праз рэальнае азнаямленне з нацыянальнай культурай, праз турыстычныя паходы, тэматычныя святы і сустрэчы з прадстаўнікамі ўлады і грамадскіх аб'яднанняў, дыскусійнае абмеркаванне праблем грамадскага жыцця.

Такім чынам, вынікі праведзенага анкетавання дазваляюць канстатаваць, што студэнцкая моладзь аказваецца недастаткова інфармаванай па палітычных пытаннях, не валодае дастатковым узроўнем ведаў, не мае склаўшыхся палітычных поглядаў і перакананняў і адпаведна не праяўляе належнай грамадска-палітычнай актыўнасці. У многім гэта вызначаецца тым, што ў сучасных умовах маладое пакаленне не адчувае свайго ўплыву на эканамічныя і сацыяльна-палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў краіне; сацыяльныя спадзяванні ў многім застаюцца нерэалізаванымі, адказнасць, якая ўскладваецца на яе ў ажыццяўленні дэмакратычных пераўтварэнняў, з'яўляецца незразумелай.

У аснове дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі павінны быць пакладзены такія прынцыпы, як улік інтарэсаў і патрэб маладых грамадзян; забеспячэнне аховы іх правоў і законных інтарэсаў; далучэнне моладзі да ўдзелу ў фарміраванні і рэалізацыі праграм, якія тычацца моладзі і ўсяго грамадства.

Такім чынам, грамадзянскае выхаванне студэнцкай моладзі звязана з працэсамі дэмакратызацыі грамадскага жыцця, фарміравання палітычных, прававых, маральных, рэлігійных перакананняў, што павялічвае ролю адукацыі ў цэлым.

Summary

The problems of the students' political culture in Belarus are investigated. The disposition and forms of political activity and political orientation under the conditions of establishment of the civil society are analysed.

УДК 32.001:342

А. І. Курак

КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ ГАРАНТЫІ ПРАВОЎ І СВАБОД ЧАЛАВЕКА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Інстытут правоў і свабод у дэмакратычнай дзяржаве з'яўляецца па сутнасці асяродкам яе канстытуцыйнага ладу. Прычым гэтыя правы і свабоды даволі шматлікія і разнапланавыя па сваім змесце, яны знаходзяць адлюстраванне ў розных нарматыўных актах. Самыя ж важныя (фундаментальныя) з іх замацоўваюцца ў Асноўным законе дзяржавы — Канстытуцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ